**М.А.Бяспалая,** *доктар*

*гістарычных навук, прафесар*

*БДУ культуры і мастаўтаў*

# ПЕРШЫЯ КРОКІ
# ПУБЛІЧНАГА ПРЫЗНАННЯ САМАБЫТНАСЦІ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Другая палова XIX ст. – гэта перыяд актывізацыі нацыянальных рухаў у Еўропе. Дзеячы мастацтва і культуры, палітыкі і навукоўцы былі ў пошуку нацыянальных ідэй. Працэс грунтаваўся на шасці асноўных духоўных крыніцах, якія з'яўляюцца падмуркам фарміравання любой ідэі. У ліку іх – вывучэнне народнай культурнай спадчыны, у першую чаргу фальклору. Даказаць аўтэнтычнасць нямецкага ці італьянскага фальклору ў разглядаемы час фактычна было немагчыма, таму ў большасці еўрапейскіх народаў фальклор быў рамантызаваны, на яго аснове і праз яго кампіляцыю ствараліся нацыянальныя эпасы, напрыклад "Калевала", "Песня аб Гаяваце", "Нямецкія казанні" і інш. У Беларусі гэтая плынь народнай культуры не патрабавала такіх высілкаў, таму што ў другой палове XIX ст. яна яшчэ існавала ў натуральным асяроддзі, сярод сялян, і з'яўлялася часткай і адбіткам іх паўсядзённага эканамічнага, сацыяльнага і культурнага жыцця. Таму, на наш погляд, у аўтэнтычнасці фальклору беларускага этнасу, які быў зафіксаваны на папяровых носьбітах, апрацаваны і выдадзены вучонымі – фальклярыстамі і этнографамі П.Шэйнам, Я.Раманавым, Я.Карскім і іншымі, сумнявацца не прыходзіцца. І сёння іх працы з'яўляюцца бясцэннай каштоўнасцю і крыніцай для сучасных фальклярыстаў-практыкаў і даследчыкаў фальклору.

Аднак ёсць пытанне ў тым, як жа і калі культурная спадчына беларусаў паўстала перад шырокай публікай. Нам падаецца, што гэты працэс пачаўся ў апошнім дзесяцігоддзі XIX ст., і пэўную ролю ў пашырэнні ўяўленняў аб самабытнасці і непаўторнасці народнай спадчыны беларусаў адыгралі выставы, на якіх афармляліся аддзелы сялянскіх кустарных вырабаў. Адной з першых была сельскагаспадарчая і кустарная выстава, якая праходзіла 1–10 верасня 1891 г. у Вільні. Актыўны ўдзел у ёй прынялі буйныя памешчыкі нашага краю, якія на сходзе Мінскага таварыства

сельскіх гаспадароў пастанавілі “склонять крестьян” да ўдзелу ў выставе і выдзелілі 100 рублёў на закупку сялянскіх кустарных вырабаў [2]. Жаданне прадэманстраваць узоры хатняй вытворчасці жанчын-сялянак на Сусветнай выставе ў Чыкага ў 1893 г. выказала нават імператрыца Марыя Фёдараўна, вестка аб гэтым распаўсюджвалася і ў беларускіх паветах. Беларускія губерні былі прадстаўлены на кустарнай выставе ў сталіцы, і князь І.Э.Друцкі-Любецкі нават падараваў абедзвюм імператрыцам па прадмету беларускіх кустарных вырабаў [3].

Думка аб практычнай каштоўнасці і непаўторнасці сама-дзельных сялянскіх вырабаў вітала сярод інтэлігенцыі і эканамічна самадастатковых колаў грамадства і ў наступныя дзесяцігоддзі. Аб гэтым сведчаць стварэнне аддзела кустарнага рамяства і выдзяленне на гэта больш за 1000 руб. падчас выставы ў 1901 г., прысвечанай 25-гадоваму юбілею Мінскага таварыства сельскіх гаспадароў. Сярод пэўных колаў губернскага Мінска існавалі ідэі стварэння ў горадзе кустарна-прамысловага музея, перасоўных выстаў, продажу кустарных вырабаў [3].

З цягам часу да выставачнага руху далучыліся і жанчыны, у прыватнасці А.А.Ваньковіч, В.А.Ваяводская і інш. Разам з губернскім земствам яны займаліся адборам экспанатаў на Усерасійскую кустарную выставу у 1913 г. [4]. Згодна водгукам “Літоўскі аддзел на гэтай выставе прыцягнуў да сябе ўсеагульную ўвагу арыгінальнасцю народнай творчасці і ўменнем ужываць чыста самабытныя матывы ва ўзорах ткацкіх вырабаў і дамашняга посуду” [10].

Восенню 1913 г. па ініцыятыве Віленскага таварыства сельскай гаспадаркі адбылася спецыялізаваная выстава кустарных промыслаў і народнай творчасці. Звыш 30 землеўласнікаў беларускіх губерняў, галоўным чынам Мінскай, ахвяравалі на арганізацыю выставы па 100 руб. Кожны разумеў “высакародны ўплыў на ўздым культуры ... народа, які акажа добра арганізаваная выстава высокаартыстычных вырабаў” [5]. Аднак з вялікімі цяжкасцямі давялося збіраць экспанаты, бо жанчыны і дзяўчаты адмаўляліся даваць на паказ сваё адзенне, у асобных вёсках лічылі, што вынікам іх удзелу ў выставе стане павелічэнне падаткаў, выказвалася апаска, што могуць палічыць удзельнікаў выставы заможнымі і не дадуць ім новых надзелаў зямлі і г.д. [5].

Тым не менш, дзякуючы дапамозе мясцовых святароў і памешчыкаў, удалося сабраць каля 8 тыс. экспанатаў. Выстава, па сведчанні арганізатараў, пераўзышла ўсе разлікі, цэлы месяц яе наведвалі вучні, рамеснікі, салдаты і інш. Яна паказала, што народ захаваў свае творчыя сілы. Вялікая роля ў наданні выставе арганічнага цэлага належыць вядомаму мастаку прафесару Ф.Рушчыцу. Экспанаты групаваліся па губернях і выразна адлюстроўвалі своеасаблівасць кожнага рэгіёна праз ткацкія,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ганчарныя вырабы. У рамесным аддзеле былі прадстаўлены цудоўныя кілімы з майстэрні маёнтка В.Ельскага – Ігнацічы. Рэдакцыя "Нашай нівы" паказала калекцыю кустарных вырабаў XVIII і XIX стст.: слуцкія паясы, старажытныя тканіны, музычныя інструменты і інш. Гэты збор атрымаў адзін з трох малых залатых медалёў. Выставу суправаджала навукова-асветніцкая і культурная праграма. У яе межах з дакладам "Кустарны промысел і народнае мастацтва" выступаў вядомы этнограф Г.Доўгірд.

У адным звязку з пашырэннем прызнання этнаграфічнай самабытнасці беларусаў адбываўся аналагічны працэс і ў галіне фальклору. Зноў жа галоўная роля ў гэтым належала Вільні. Менавіта там, у зале чыгуначнага гуртка, 12 лютага 1910 г. адбылася першая беларуская вечарына. "Наша ніва" пісала: "Першы раз павінна была паказацца перад шырокім светам народная беларуская думка, явіцца ў сваіх песнях, танцах, музыцы" [9]. Газета прыводзіць найбольш выразныя водгукі ў прэсе аб гэтай падзеі і сярод лепшых лічыць ацэнку літоўскай "Viltis", якая пісала: «Пад камандай п. Рагоўскага хор надта пекна прапеяў беларускіе народные песьні, у кожнай драбніцы відаць было работу праўдзіваго артысты. Простые беларускіе песьні на сцэне прыдбалі сабе не малую артыстычную вартасьць. Далей ішлі беларускіе народные танцы: "Юрка", "Лявоніха", "Мяцеліца" і "Верабей", – танцоры скакалі, і так жыва, так горача, што ажно заваражылі публіку. Дзяўчаты і мужчыны ўсе былі ў праўдзівых народных апратках, каторые выглядалі надта пекна. С песень, танцаў і апратак веяло шырокім Палесьем, веяло душой беларускаго народа» [10].

У "Нашай ніве" таксама была размешчана невялікая заметка аб першай беларускай вечарынцы. Аўтар яе падкрэсліваў, што ў спевах "чутно было ... не разгул велікаруса з-пад Волгі, не бойкую гульню паляка, але замкнутую ў сабе самой душу беларуса ... Некаторыя песні хор выконваў па некалькі разоў, праз гоман. І далей: "Мы не ведалі, што ёсць беларуская песня і што яна асобная, свая беларуская, мае свой дух ..." Такое ж захапленне выклікалі і беларускія танцы. Усе крычалі: брава! біс! Аўтар заметкі пісаў: «... ажно сцэна грымела ад ліхога топату і ў вачах зіхацела, як ішлі лявоніху, мяцеліцу або як 10 пекна прыбраных пар завіваліся доўгім хвастом у "вераб'і"» [9].

Нават мясцовыя польскія газеты "Kurjer Litewski" і "Koniec Wilenski" высока ацанілі першую беларускую вечарыну, падчас

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якой “загаварыла паэзія народа ...” Такім чынам, беларускай разначыннай патрыятычна настроенай інтэлігенцыяй і заможнымі коламі нашага грамадства на памежжы XIX–XX стст. было зроблена многае для ілюстрацыі і доказу самабытнасці беларускай народнай культуры і мастацтва, аб чым да гэтага часу пісалі толькі навукоўцы – этнографы і фалькларысты.

Падзеі першай сусветнай вайны, рэвалюцый 1917 г. і грамадзянскай вайны не спрыялі актыўнаму і markдзнабаковаму культурнаму жыццю і яго вывучэнню. Пэўныя зрухі пачаліся ўжо ў пачатку 1920-х гг. Пачаткам афіцыйнага прызнання самабытнасці беларускага мастацтва і народнай культуры можна лічыць культурную праграму нашай дэлегацыі на I Усерасійскай сельскагаспадарчай і кустарнай выставе. Яна пачала працу ў жніўні 1923 г., аднак яе адкрыццю папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа.

Было ясна, што без экспанатаў па этнаграфіі і побыце выстава проста можа не адбыцца, бо не будзе чаго паказваць. Галоўная адказнасць за іх збор была ўскладзена на Інстытут беларускай культуры, які прыцягнуў да гэтай працы вясковае настаўніцтва. Але, як і дзесяцігоддзе назад, насельніцтва ў лепшым выпадку паказвала рэчы для апісання, не даючы іх у рукі, таму што людзі не бачылі ніякіх гарантый з боку агітатараў. Настаўнікі абышлі ўсе вёскі, але вынікі аказаліся нездавальняльнымі. Некаторыя школьныя работнікі з Ігуменскага і Барысаўскага паветаў закладвалі ўласныя рэчы, трацілі грошы, каб атрымаць што-небудзь для выставы [1]. Дзякуючы гэтым мерам і самаадданасці настаўніцтва ўдалося сабраць цікавыя экспанаты: каля 70 беларускіх паясоў, 40 вышывак, 10 музычных інструментаў, мадэлі дзвюх тыповых сядзіб, каля 50 вырабаў з бяросты і лазы, шмат відаў лячэння з народнымі замовамі [6].

На выставе планаваліся ў асобным выставачным тэатры пастаноўка п’ес, паказ гульняў і іншых нумароў культурнай праграмы, каб бліжэй пазнаёміцца з мастацтвам і побытам асобных народнасцей. Вызначэнне культурнай праграмы беларускай дэлегацыі ішло даволі складана. Аднаму з кіраўнікоў рэспублікі падалося неабходным паслаць у Маскву сляпога лірніка, але праз некаторы час перадумалі, і на месцы пайшла такая тэлеграма: “Прыміце ў тэрміновым парадку ўсе захады да пошуку ў павеце лірніка і дамоўцеся з ім аб умовах паездкі на адзін месяц у Маскву. Пажадана, каб лірнік быў не сляпец-жабрак, а стары селянін і каб,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акрамя святарных песнапенняў, мог паказаць у сваіх песнях карціны з мінулага Беларусі” [7]. На Случчыне ў вёсцы Мусічы знайшлі лірніка К.Караленку, у рэпертуары якога было больш за 20 песень, сярод іх “Беларуская марсельеза”, “Захацела бабуленька разам узбагацеці”, “Маці Боска” і інш. [8]. У Барысаў і Ігумен былі адпраўлены тэлеграмы падобнага зместу, але размова ўжо ішла пра дудароў, якія павінны былі выконваць народныя танцы і песні, абавязкова быць апранутымі ў беларускае адзенне. Самабытнае выступленне лірніка і дудароў павінна было з’яўляцца своеасаблівай ілюстрацыяй да экспазіцыі этнаграфіі і побыту [8].

19 жніўня 1923 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы. Тагачасная прэса і шматлікія наведвальнікі адзначалі афармленне беларускага павільёна, дзе вельмі ўдала быў паказаны менавіта побыт беларускага народа. Сапраўды, хваліцца дасягненнямі ў эканоміцы падстаў не было, таму аўтары экспазіцыі зрабілі (можа, чыста інтуітыўна) правільны нацiск на своеасаблівасці прыродных умоў, этнаграфіі і культуры Беларусі. У адной з газетных вытрымак вельмі трапна адзначалася, што ніякія гаспадарчыя дасягненні Савецкай улады не прыцягвалі такой увагі публікі і замежных гасцей, як беларускі хор, што заўсёды выступаў у нацыянальным адзенні, як тэатр і балет.

Аб адкрыцці беларускага павільёна ў прэсе было змешчана шмат рэпартажаў. Вось адзін з іх у газеце “Савецкая Беларусь” за 24 жніўня: “Ганак прыгожы, квяцісты, рознакаляроваю тканінаю прыбраны, а каля ганку прыгожым паўколам сабралася беларуская моладзь. Квітнеюць вопраткі. Скончыліся спевы. Выйшаў дзед-беларус, дуду ўзяў, загаварыла дуда. Яшчэ адзін да яго падсеў на ганак – на ліры зайграў”.

Экспазіцыя карысталася вялікай папулярнасцю, толькі ў верасні яе наведалі 134 экскурсіі. Шматлікіх наведвальнікаў настолькі ўзрушыла сустрэча з роднай культурай, што ў кнізе водгукаў з’явіліся вершы, пажаданні. Напрыклад, У.Дубоўка, які ў гэты час працаваў сакратаром, а потым намеснікам паўнамоцнага прадстаўніка Наркамата асветы БССР у РСФСР, пісаў: “Беларусы паказалі на выстаўцы толькі частку, нават нязначную, таго, што яны маюць, і гэта дае шмат і шмат цікавага і каштоўнага. Будзем спадзявацца, што ў наступныя разы мы зоймем сваімі экспанатамі належнае нам месца”.

21 жніўня ў Крамлёўскім клубе адбыўся канцэрт усіх дэлегацый. Беларусь прадстаўляў хор пад кіраўніцтвам Тэраўскага і балет. Хор

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выканаў “Беларускую марсельезу”, цыкл вясельных песень, які надта спадабаўся слухачам, а выкананне “Лявоніхі” і “Юрачкі” пад цымбалы выклікала шмат апладысментаў. Беларускія музычныя інструменты вельмі зацікавілі спецыялістаў. Была створана камісія пад кіраўніцтвам прафесара Любімава, якая пачала абследаванне вартасці беларускіх цымбалаў наконт іх прыстасавання да выканання самых складаных музычных твораў, дыферэнцыяцыі іх на чатыры разрады – кантрабас, бас, альт і прыма – з рэгуляванем сілы гуку, як у раяля.

2 верасня адбыўся вялікі вечар з удзелам хору, аркестра старасвецкіх музычных інструментаў, спявачкі Ірмы Яўнзем, балетнай групы. Пра гэты вечар у газеце “Известия” была змешчана грунтоўная рэцэнзія, вельмі трапна паказана сутнасць адраджэння беларускай культуры: “Адраджэнне беларускага народа ў галіне культуры карыстаецца, галоўным чынам, сваёй новай літаратурай і тэатрам. Адраджэнне ідзе ад мужыцкага, сялянскага народа і яго інтэлігенцыі, якая выйшла з сялян і зноў вярнулася да свайго мужыцкага народа”.

Такім чынам, знаёмства шырокіх колаў разнастайнай публікі з узорамі народнага мастацтва дазваляла пашыраць уяўленне і разуменне непаўторнасці і самабытнасці культуры беларусаў. Фальклорныя вечарыны, этнаграфічныя аддзелы на выставах працавалі ў гэтым кірунку, а ў савецкі час культурная праграма беларускай дэлегацыі стала першым выхадам беларускага мастацтва за межы рэспублікі. Яна пазнаёміла многіх людзей, прадстаўнікоў розных народаў свету, з Беларуссю, яе народнымі традыцыямі і мовай. Хаця выстава была арганізавана з прапагандысцкімі мэтамі, але ад гэтага значэнне падзеі не знізілася. Выступленне прадстаўнікоў беларускага мастацтва і культуры на выставе стала яскравым доказам самабытнасці беларускага этнасу, яго мовы і культуры, своеасаблівым абгрунтаваннем права беларусаў на самастойнае існаванне і развіццё.

---

1. *Дзяржаўны* архіў Мінскай вобласці, ф. 306, в. 1, спр. 49, л. 262.

2. *Журнал* Минского общества сельских хозяев, 7 марта 1891 г., с. 3.

3. *Журнал* Минского общества сельских хозяев, 12 дек. 1901 г., с. 21.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Журнал* Минского общества сельских хозяев, 8–9 дек. 1912 г., с. 27.

5. *Журнал* Минского общества сельских хозяев, 9 дек. 1913 г., с. 21–22.

6. *Нацыянальны* архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 645, в. 1, спр. 7, л. 499 зв., 814.

7. *Там жа,* спр. 12, л. 124.

8. *Там жа,* спр. 7, л. 279; спр. 12, л. 254, 256.

9. *Першая* беларуская вечарынка // Наша ніва. – 1910. – 18 лютага.

10. *Віленскіе* газэты аб беларускай вечэрынцы // Наша ніва. – 1910. – 25 лютага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ